ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org

№ 10(285) 15 — 22 сакавіка 2003 г.

TV ПРАГРАМА 17 сакавіка – 23 сакавіка

СОЦИОЛОГИЯ
наш автор анализирует результаты февральского опроса НИСЭПИ

ЭКСПОРТ ДЕМОКРАТИИ
наш корреспондент рассказывает о внешнеполитической доктрине США

СТР. 6

ПАМЯТНИК АРХИТЕКТУРЫ XX ВЕКА
наш автор рассуждает о столичном вокзале

БЕЛОРУССКИЕ ВОПРОСЫ

ДОРВАТЬСЯ ДО КУЛЬТУРЫ



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Конституционный акт», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-КУВАЕВ

АЛЕКСЕЙ МАКОВЕЦ

Для белорусов критерии элитарности намного ниже, нежели для россиян. То, что даже у русских соседей становится бытовой банальностью, — элитарная фенька и писк моды в белорусской столице.

КИНО НЕ ДЛЯ ВСЕХ

Масяня и Хрюндель – новые лица новой России. Теперь – на новых открытках, что продаются в Беларуси. Масскультовые, попавшие в «точку ру» после закрытия «Намедни», они снова в белорусском реестре «Для продвинутых». Теперь их похождения смогут отследить только реальные (не реже раза в неделю и не меньше часа с приличной скоростью) пользователи интернета. Для остальных остаются только поздравительные открытки с продвинутыми изображениями.

Та же неделя японского кино не была бы столь значительным культурным событием для Минска, имей минчане более свободный доступ к видеопродукции. Если бы хоть в столице набралось довольно пользователей «железа» с доступом к формату *MPEG-4*. Если бы видеомагнитофон был таким же предметом бытовой техники, как и телевизор. И если бы в стране существовал полноценный цифровой рынок развлечений с достойным выбором культурных достижений на *CD* и *DVD*. Легальный цивилизованный рынок, а не сумма лавочек, снабжающих местную продвинутую аудиторию ошметками с пиратского рынка России.

Российским видеопиратам и их белорусским коллегам стоит сказать отдельное спасибо. Именно их трудами элитарно-фестивальная «Сонатина» Такеши Китано доступна в цифровом формате белорусским владельцам *PC*.

АРТЕФАКТЫ ИНОЙ ЦИВИЛИЗАЦИИ

Куваевская Масяня, проживая в питерской трущобе с тараканами, звонит по мобиле и торчит в интернете. Для обитателей минских хрущоб мобила – артефакт преуспевания, стоящий скоро после шестисотого «мерседеса». Едва снизились тарифы на беспроволочный дозвон, население помоложе, то же студенчество, кинулось приобретать говорящие игрушки.

Изрядная доля популярности мобильной связи в молодежной и прочей среде – не насущная потребность в оперативном обмене информацией. Знаковый характер мобильного телефона – не менее серьезный критерий в его приобретении, чем удобство. Для белорусов сотовый телефон – признак принадлежности к элите, свидетельство высокого социального статуса. Вот и трезвонят по раздолбанным минским троллейбусам, в давке с кошелками, артефакты информационно-технологического общества.

Из того же реестра «для узкого круга» – презренный «Макдональдс». Кто питался в советских школьных столовых, у того рука не поднимется метнуть камень в витрину с бигмаками. До турецких кофеен и японских суши-баров менчуки вовсе не доросли. Правда, недавно в центре Минска, спустя дюжину независимых лет, отрылся ресторан «Планета Суши». Теперь у столичной элиты есть выдающийся пункт элитарного питания.

Флэш-анимационная «Масяня» по сети, мобильные телефоны, беспроводной интернет и брелки *USB*-накопителей вместо допотопных дискет суть приметы элитарности по-белорусски. Ее слагаемые – друг другу и причины, и следствия. Культурная заторможенность, технологическая отсталость и белорусский хит – экономика социального застоя, предполагающая минимальную эффективность при максимальной занятости.

НЕ ТУДА

Наиширочайший доступ белоруса в интернет – задача куда насущнее строительства библиотечного многогранника. Не больше библиотек и домов культуры на район, а больше серверов, провайдеров, оптико-волоконных линий. И все электронные библиотеки мира станут белорусскими!

Причина здешней местечковой задвинутости состоит не в том, что среднестатистический россиянин от природы радикально интеллектуальнее среднего белоруса. Деньги у нас не туда идут!

Провозглашая развитие информационных технологий, государство упорно финансирует убыточные заводы-колхозы. Попутно изводя частного инвестора официальным налогом, нелегальным побором, правовым нигилизмом.

Но прогресс на месте не стоит, и тот же «байнет» мало-помалу развивается. Только вот письма из Минска в Минск приходится отправлять с московских серверов. А интернет-карты, зачастую, приобретают популярность не от большого их удобства, а от снижения качества беспарольного дозвона, предоставляемого «Белтелекомом».

Открываются кое-где в сельской районной глубинке компьютерные клубы. Славно, но – увы. Общественные бани наиболее процветают при отсутствии ванных в квартирах.

Такое чудо цивилизации, как спутниковое телевидение – особая тема. Обеспечить пакетами евровещания каждую вторую семью – и будет любопытно посчитать, как долго продлится эпоха президента Лукашенко. Так что есть свой резон в строительстве символической библиотеки вместо инвестиций в телекоммуникации.

Белорусы относительно недавно столкнулись с более-менее приличным качеством потребления, причем все больше – российским. Россияне после середины 1990-х стабильно осваивают иной уровень культуры, в частности потребительской. Белорусы же в своей массе этого высокого качества новой продукции нового мира не то чтобы не распробовали – не вкусили толком. Достаток по-нашему – это прогулки на маршрутном такси и «Клинское» с «Бочкаревым» вместо «Криницы». Свое жилье и автомобиль – уже признаки богатства. Где уж тут интернет в каждый дом или в школу, как в России!

Социальная стабильность в Беларуси компенсируется культурной стагнацией. Ведь у профессора Преображенского запросы куда выше, чем у Шарикова Полиграф Полиграфовича.

Вечная дефибрилляция отстойной индустриально-аграрной системы тормозит развитие информационно-технологического общества. Зато маскирует бедность белорусского быта и нищету духа. ■

ВАР'ЯЦТВА

Справаздача трупамі

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

Сярэдняя колькасьць жывёлаў, якіх цягам году адлоўліваюць і забіваюць адмысловыя службы ў Менску, — каля 12 тысячаў. Адсутнасьць закону пра абарону жывёлаў дазваляе бясчынствы супрацоўнікам гэтай сфэры.

Службу адлову сталічнага прадпрыемства «Спэцкамунаўтатранс» спрабуюць прыцягнуць да адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасьці – сярод шматлікіх парушэньняў у працы службы адлову – адсутнасьць уліку сродку для эўтаназіі жывёлаў «Т-61»: шклянкі з-пад сродку папросту выкідаюцца, а справаздача даецца трупамі забітых жывёлаў.

Каб на ўласныя вочы пабачыць, як выконваюцца патрабаваньні заканадаўства ў прадпрыемстве «Спэцкамунаўтатранс», сябрамі жывёлаахоўных арганізацыяў «Ратаваньне», «Каштанка» і дэпутатам Менгарсавету Даньковым быў праведзены адмысловы рэйд. У часе рэйду выявілася, што парушаецца большасьць патрабаваньняў адпаведнай пастановы Міністэрства жыльлёва-камунальнай гаспадаркі.

Пачнем з таго, што насельніцтва нашае краіны па-ранейшаму мае ілюзорныя ўяўленьні пра слова «засыпленьне». Можна падумаць, што размова – сапраўды пра гуманную эўтаназію.

Але ж насамрэч ветэрынарныя лякарні, куды звычайна зьвяртаюцца людзі, каб засыпіць хворую жывёліну, маюць права выканаць жаданьне наведніка толькі ў выпадках небясьпечных для чалавека хваробаў (скручанасьць, лішай) ці ў выпадку, калі жывёліна цяжка траўмаваная. Для гэткіх выпадкаў ветэрынары ўжываюць сродак пад назвай «Т-61» – ён сапраўды дазваляе істоце заснуць, а потым ціха, бяз болю сканаць.

Але ж ва ўсіх іншых выпадках ветэрынарныя лякарні ня маюць права засыпляць жывёліну – паводле загаду галоўнага ветэрынара Менску Вацлава Рамашкі, яны накіроўваюць людзей, якія з тых ці іншых прычынаў жадаюць разьвітацца з коткай ці сабакам, у службу адлову. Каля адной з гарадзкіх ветэрынарных лякарняў ёсьць адмысловае месца, куды штодня прыязджае машына ад «Спэцкамунаўтатрансу» ў вызначаную гадзіну. Туды і адпраўляюць людзей нібыта засыпляць жывёлінаў.

СНЫ ПРА ЗАСЫПЛЕНЬНЕ

У часе рэйду машыну чакалі ўсе разам – яна спазьнялася. Зь пяці гаспадароў, якія хацелі пакінуць гіцлям сваіх калісьці любімых істотаў, тры назвалі за прычыну *«самім няма чаго есьці»*. Узгадалі, што кошты на камунальныя паслугі ўзьняліся, пэнсіі малыя і гэтак далей.

Урэшце зьявілася машына – хлопцы-гіцлі вельмі сьпяшаліся. Удзельнікі рэйду запатрабавалі паказаць, як выглядае машына знутры. Гіцлі, натуральна, паказваць машыну не хацелі і ўзгадвалі, што ніхто ня мае права іх фатаграфаваць і глядзець у тую самую машыну. Калі з дапамогаю сілы машыну ўсё ж адчынілі, усё стала зразумела.

На фатаздымку бачна, што некаторыя з жывёлінаў яшчэ не сканалі, некаторыя ўжо мёртвыя, – і туды ж закідваюць новых, яшчэ жывых. Машына сьмярдзела: відавочна, некаторыя зь небаракаў ляжалі ў ёй мёртвымі ня першы дзень.

Усё, што мы пабачылі, груба парушала пастанову Міністэрства жыльлёва-камунальнай гаспадаркі № 23 ад 29 сьнежня 2001 году пра дазволеныя дзеяньні ў часе адлову бадзяжных жывёлаў. Паводле пастановы, адлоўленых (ці здадзеных насельніцтвам) жывёл належыць даставіць у адмысловы пункт прыёму ў дзень адлову.

Адлоўленыя бадзяжныя жывёліны дастаўляюцца ў ветэрынарныя службы дзеля прафэсыйнага агляду: пасьля яго ветэрынары разам са службай адлову мусяць прыняць рашэньне пра далейшае выкарыстаньне жывёлаў. Эўтаназія павінна зьдзяйсьняцца пад кантролем ветэрынара ў адмыслова абсталяваным памяшканьні.

Гіцлі паведамілі, што яны ня маюць права засыпляць жывёлаў, што мёртвыя жывёліны засталіся ў машыне зь мінулага рэйсу і што засыпляе жывёлінаў майстар на тэрыторыі «Спэцкамунаўтатрансу».

ХІБА ТРУПЫ НЕ СПРАВАЗДАЧА?

Калі рэйд дабраўся да «Спэцкамунаўтатрансу», хлопцы ўжо паведамілі пра здарэньне, і майстар Чэслаў Алексюк сустрэў нас з торбачкай у руках. У ёй былі шклянкі з «Т-61». Ён аддаў сродак гіцлям, якія раней казалі, што засыпленьнем не займаюцца, і патлумачыў, што можа паказаць усе адпаведныя паперы ў сябе ў пакоі. То бок, усе гіцлявы пасьведчаньні, дзе сьцьвярджаецца, што іх пазнаёмілі з тэхнікай бясьпекі пры засыпленьні жывёлінаў, захоўваюцца ў іх майстра ў шафе. Пра супрацоўніцтва зь ветэрынарамі, да якога абавязвала згада-

Заканчэньне на стар. 6 ➲

АНЕКДОТ-С

Когда в российской думе дебатировался вопрос о переименовании Волгограда в Сталинград, с того света пришла телеграмма: «Оставьте все, как есть. Иосиф Волгин».

***

Специально для российских думцев устроили экскурсию в ад. Видят они, что Гитлер стоит в дерьме по шею, а Сталин только по пояс. Коммунисты тут же стали радоваться, что даже в аду Сталину меньше достается, чем Гитлеру. Но черт-экскурсовод им объяснил, что Сталин стоит на плечах у Ленина.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ



«Волею судьбы мне пришлось учиться в Белорусском государственном экономическом университете»

(полковник Л. Прищепа, «Во славу Родины», 11.03.03)



«Понятие народовластия не противоречит принципу демократии»

(Л. Кришталович, «Народная газета», 12.03.03)



«Однако демократические права белорусского народа и государства не должны ущемляться в угоду личным интересам отдельных псевдополитиков»

(А. Лукашенко, пресс-служба ПРБ, 11.03.03)

НАВІНЫ

Акт. 11 сакавіка ў Мінск для ўдзелу ў 4-м пасяджэнні беларуска-расійскай камісіі па падрыхтоўцы Канстытуцыйнага акта прыбыла расійская дэлегацыя на чале са спікерам Дзяржнудумы Генадзем Селязнёвым. Селязнёў заявіў журналістам, што праект Канстытуцыйнага акта *«ў добрым стане, па прынцыповых пытаннях ёсць поўнае разуменне»*. Спікер Дзяржнудумы лічыць, што на праект дакумента можа быць прыняты членамі камісіі за аснову. Потым, паводле яго слоў, у Маскве павінна прайсці яшчэ адно пасяджэнне камісіі, пасля якога дакумент будзе прадстаўлены на разгляд Вышэйшага дзяржаўнага савета саюзнай дзяржавы.

Сакратар. Новым прэс-сакратаром Міністэрства замежных спраў Беларусі прызначаны Андрэй Савіных. Дагэтуль ён працаваў намеснікам начальніка ўпраўлення інфармацыі МЗС. Былы прэс-сакратар Павел Латушка 6 снежня 2002 года ўказам прэзідэнта быў прызначаны надзвычайным і паўнамоцным паслом Беларусі ў Польшчы. Андрэй Савіных стаў трэцім па ліку прэс-сакратаром у гісторыі беларускага знешнепалітычнага ведамства. Першым, як вядома, быў Мікалай Барысевіч, які цяпер працуе ў беларускім пасольстве ў Празе.

Лекцыі. Нацыянальны навукова-асветніцкі цэнтр імя Францішка Скарыны распачаў цыкл бясплатных публічных лекцый па праблемах беларускай культуры і нацыянальнага развіцця ва ўмовах глабалізацыі, месца Беларусі ў сусветнай супольнасці. Лекцыі будуць праводзіцца адзін раз на месяц. Яны павінны садзейнічаць грамадзянскаму міру і яднанню грамадства. Дырэктар цэнтра мяркуе, што для вучоных лекцыі стануць своеасаблівай генеральнай рэпетыцыяй перад выступленнямі для замежнай аўдыторыі.

Праца. Пасля вяртання ў Гродна асуджаны журналіст Мікола Маркевіч уладкаваўся на працу экспедытарам. Рэдактар зачыненай судом газеты «Пагоня» пачаў працаваць у фірме «Верасень». Ён будзе займацца экспедыцыяй грузаў па Беларусі. Такая праца, па словах Маркевіча, дазволіць яму *«ў поўнай ступені займацца журналісцкай і грамадскай дзейнасцю»*. *«Я спадзяюся, што міліцыя пойдзе насустрач і, нягледзячы на мой невыязны статус, дазволіць зарабляць грошы менавіта такім чынам»*, – сказаў Мікола Маркевіч. Паводле рашэння суда, які замяніў «хімію» на больш мяккае пакаранне, цяпер асуджаны журналіст павінен выплочваць 15 працэнтаў атрыманага заробку.

Экзамены. Пад кантроль дзяржавы неабходна ўзяць не толькі будучыя ўступныя экзамены, але і ўвесь працэс цэнтралізаванага тэставання, якія пачнецца ўжо ў канцы сакавіка. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка 10 сакавіка на сустрэчы са старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю Анатолем Тозікам, абмяркоўваючы праблемы падрыхтоўкі і правядзення ўступных экзаменаў у 2003 годзе. Як лічыць прэзідэнт, кантроль за цэнтралізаваным тэставаннем дазволіць забяспечыць справядлівыя ўмовы пры паступленні ў навучальныя ўстановы. Тозік паведаміў аб выніках праверкі эфектыўнасці выкарыстання дзяржаўнай уласнасці і бюджэтных сродкаў у сістэме прафесійна-тэхнічнай адукацыі, а таксама аб выніках комплекснай праверкі фінансава-гаспадарчай дзейнасці рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Белтрансгаз».

Пісьменства. Распараджэннем прэм'ер-міністра Беларусі Генадзя Навіцкага створаны Нацыянальны аргкамітэт па падрыхтоўцы і правядзенні 7 верасня ў Полацку 10-га нацыянальнага свята – Дня беларускага пісьменства. У склад аргкамітэта, які ўзначаліў віцэ-прэм'ер Уладзімір Дражын, увайшлі 16 чалавек, у тым ліку міністры інфармацыі, адукацыі, культуры і замежных спраў, прэзідэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прадстаўнікі Адміністрацыі прэзідэнта, Савета міністраў і мясцовых органаў улады.

Адукацыя. Студэнты краін Еўропы абвясцілі сакавік месяцам барацьбы з платнай адукацыяй. 13 сакавіка ў многіх еўрапейскіх краінах прайшлі акцыі супраць ператварэння адукацыі ў аб'ект гандлю. Беларускае студэнцтва ў Еўропе прадстаўляе незарэгістраваная грамадская арганізацыя «Задзіночанне беларускіх студэнтаў», якая таксама далучыцца да еўрапейскай студэнцкай кампаніі. Як паведаміла прадстаўніца міжнароднай камісіі ЗБС Тацццяна Хома, беларуская сістэма нібыта выпадае з агульнай карціны адукацыі ў Еўропе. Паводле яе слоў, існуючая ў краіне платная адукацыя не адпавядае беларускаму заканадаўству, пра што сведчаць шэраг выпадкаў, калі плата ў ВНУ павышаецца з парушэннем дагавораў. Прадстаўнік ЗБС лічыць, што з-за недахопу інфармацыі студэнты часцей за ўсё не ведаюць, як абараняць свае правы.

Грып. Сёлетняя эпідэмія грыпу ў Беларусі носіць зацяжны характар, пры гэтым узровень захворвання насельніцтва будзе ніжэй, чым у папярэднія гады. Нарастанне выпадкаў захворвання на грып назіралася ў лістапада 2002 года. Эпідэмічны рост захворвання пачаўся з аднаго з 18 кантрольных гарадоў – Мазыра, дзе ўстойлівае праяўленне эпідэміі рэгістравалася з 6 лютага. Спецыяліст адзначыў, што пік захворвання ў гэтым горадзе дасягнуты з 10 па 16 лютага, калі было зарэгістравана 207 выпадкаў грыпу на 10 тысяч насельніцтва (2002 год – 275 выпадкаў на 10 тысяч). Потым адбывалася паслядоўнае зніжэнне ўзроўню захворвання і з 7 сакавіка ў Мазыры былі адменены ўсе супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы.

Франкафонія. Тыдзень фракафоніі пройдзе ў Мінску з 17 па 24 сакавіка. Праграма мерапрыемства, падрыхтаваная аддзелам супрацоўніцтва і культуры пасольства Францыі ў Беларусі, уключае святкаванне 200-годдзя з дня нараджэння Праспера Мерымэ і 100-годдзя Жоржа Сіменона, паказ тэатральнай пастаноўкі па навелах Альбера Камю, правядзенне першага ў Мінску франкафоннага форуму і ўручэнне літаратурнай прэміі франкафоніі.

ФЭСТ

Прагрэс супраць цемрашальства

ГЕНАДЗЬ СЯНКЕВІЧ

Людзі старэйшага пакаленьня доўга яшчэ будуць зьдзіўляцца розным парадоксам постсучаснасьці, а больш маладыя здольныя ўспрымаць як норму аб'яву кшталту «8 сакавіка ў будынку Палацу піянэраў прайшоў рыцарскі фэст». Ну і што? Калісьці і ў графскіх замках праходзілі піянэрскія сходы.

8–9 сакавіка на Камсамольскім возеры ў Палацы дзяцей і моладзі (былых піянэраў) менскія рыцарскія клюбы сапраўды ладзілі шоў. Дэманстраваліся бляшана-сьлясарскія вырабы і тэхніка індывідуальнага і групавога мачылава з выкарыстаньнем бутафорскай зброі, дужа падобнай да сапраўднай.

У першы дзень менскія рыцары маглі сьвяткаваць сапраўдную перамогу. У індывідуальным заліку ўпершыню перамог тутэйшы ваяр, які змагаецца пад псэўданімам Хлодвіг. Раней зазвычай перамагалі больш прасунутыя ў гістарычным фехтаваньні маскалі.

Другі дзень фэсту адзначыўся вялікай гала-бойкай «сьценка на сьценку», якая ў любога этнасацыёляга выклікала б асацыяцыі з чым заўгодна, ад масьленічных кулачных баёў да разборак фанаў менскага «Дынама» з фанамі магілёўскага «Дняпра» пад Асіповічамі. Два натоўпы, узброеныя дасьпехамі самага рознага кшталту, калацілі ў драўляныя шчыты бляшанымі мячамі, як атрад міліцыі асобага прызначэньня перад разгонам несанкцыянаванага мітынгу. Пасьля дуэлянты пачалі сыходзіцца, як барцы сумо, штурхаць адзін аднаго сваімім шчытамі і зьверху біць па шаломах супраціўнікаў мячамі.

У цеснай залі палацу дзяцей і моладзі запахла перцам і заказытала ў горле. Нехта разрадзіў балёнчык з газам. Ці не хтосьці з рыцараў? Ва ўсялякім разе працяг таўкучкі перанесьлі на адкрытую прастору, бо надвор'е дазваляла.

Новы від спаборніцтва называўся «барацьба за шалікі». Працііўніка трэба было ня толькі паваліць, але і адвязаць яму шалік з рукі, што ў дапытлівага этноляга таксама выклікала б асацыяцыі зь дзікімі забавамі футбольных фанатаў, а не зь песьняй Раланда і подзьвігамі Ланцэлота. Калі нехта з варожага кліну прарываўся праз строй, яго абкружалі тры-чатыры рыцары і лупцавалі ўсе разам, добра, што не нагамі.

Што ж! У сярэднявечнага рыцара ўнутры нашыя апілкі! Як кажуць, спачатку амуніцыя – кодэкс гонару пасьля. ■

НАВСТРЕЧУ ВЫБОРАМ

Нецьвярозая Беларусь

ЮЛІЯ ДРАНЧУК

Каля 30 тысячаў падлеткаў цягам 2002 году затрымліваліся супрацоўнікамі правааховы ў нецьвярозым стане. Больш за 11 тысячаў алькаголікаў — падлеткі.

Кожнае трэцяе злачынства, учыненае падлеткам, і кожнае чацьвёртае наагул зьдзяйсьняецца ў нецьвярозым стане. Тым часам, больш за 4 тысячы супрацоўнікаў гандлю былі прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасьці за продаж алькагольных напояў няпоўнагадовым. Болей за 2 тысячы грамадзян адказвалі за спойваньне малалетніх.

Мэдыкі й адмыслоўцы МУС называюць узровень алькагалізацыі насельніцтва Беларусі небясьпечным. На тле гэткай катастрафічнай сытуацыі спэцыялісты лічаць некарэктным становішча ў нашай краіне з рэклямай алькаголю і тытуню.

Уладзімір Максімчук, галоўны нарколяг Беларусі, лічыць, што беларускае грамадзтва папросту малапісьменнае ў пытаньнях здаровага ладу жыцьця: *«Паўсюдным ёсьць вельмі паверхневае ўяўленьне і пра сьпіртовыя напоі, і пра наркатычныя рэчывы – людзі сапраўды почасту ня ведаюць, наколькі лёгка можна патрапіць у залежнасьць ад наркатычнага рэчыва, наколькі гэта небясьпечна»*.

На думку Ўладзіміра Максімчука, відавочна, што бракуе сацыяльнай працы, сацыяльнай рэклямы, працы з моладзьдзю, супрацы з грамадзкімі арганізацыямі. Бо нарколягі не знаходзяць пакуль узаемаразуменьня зь беларускім тэлебачаньнем. *«І ўрэшце рэкляма алькаголю, папросту папулярызацыя алькагалізму, па сутнасьці, ідзе на нас і нашых дзяцей з экрану шквалам. Рэклямныя плякаты разнастайных цыгарэтаў – гэта таксама насаджэньне стэрэатыпу. Асабліва гэта ўзьдзейнічае на падлеткаў – чые жыцьцёвыя погляды яшчэ не ўсталяваліся, чыя псыхіка вельмі рухомая, – яны ж імкнуцца быць падобнымі да кагосьці»*.

Па ўсім сьвеце адмыслоўцы кажуць пра недазваляльнасьць рэклямы алькаголю й тытуню, пра шкоду яе для грамадзтва. Але ж людзі, адказныя за вулічную рэкляму ў Мінску, тлумачаць нарколягу Максімчуку, што ў нас рэкляма не цыгарэтаў, а папросту гандлёвай маркі.

Паводле сусьветных дасьледаваньняў, антытытунёвая кампанія мае эфэктыўнасьць 20 адсоткаў, а антыалькагольная – 15. Але калі ў Беларусі цягам 11 месяцаў мінулага году з прычыны занадта моцнага алькагольнага атручваньня памерлі 2338 чалавек, рэкляма здаровага жыцьця падаецца насьпелай. ■

ПРЭС-ХАТА

Вяртанне «хіміка»

На мінулым тыдні з «хіміі» вярнуўся рэдактар зачыненай газеты «Пагоня» Мікола Маркевіч. Вызваленне няпоўнае, але журналіст ужо актыўна пагрузіўся ў вір гродзенскіх падзей. Сваімі планамі ён падзяліўся з карэспандэнтам Алесяй Гордзінай.

– Аб замене вам неадбытай часткі пакарання больш мяккім хадайнічала адміністрацыя папраўчай установы. Гэта што – добры жэст уладаў?

– Гэта звыклая тэхнічная працэдура для кожнага асуджанага, калі ён адбыў 1/3 частку пакарання. Адміністрацыя ўстановы аналізуе, як чалавек сябе паводзіў, як ставіцца да яго калектыў, у якім ён працуе. І на падставе гэтага прымае рашэнне. У маім выпадку былі яшчэ два моманты, якія вельмі істотна, думаю, паўплывалі на актыўнасць адміністрацыі. Найперш, тое, што я знаходзіўся ў Асіповічах, ужо само па сабе было злачынствам з боку кіраўнікоў Камітэта выканання пакаранняў. Паводле іх лукашэнкаўскага закона, я, як чалавек, які мае непаўналетніх дзяцей, павінен быў ад пачатку адбываць пакаранне па месцы жыхарства. Адправіўшы мяне за 400 кіламетраў ад дома, яны парушылі свае законы. Чаму так хутка і аператыўна мяне накіравалі на папраўчыя работы па месцы жыхарства: яны проста выправілі сваю папярэднюю памылку.

Другі момант – мой прысуд стаў пакараннем таксама і для асіповіцкіх міліцыянтаў. Такой увагі з боку дыпламатаў, журналістаў, вельмі вядомых людзей яны не бачылі за ўсё сваё жыццё. І, канечне, пачувалі сябе пад такім пільным вокам вельмі няўтульна.

Ну і я таксама не скідваю з шаляў тое, што міліцыянты аказаліся ў Асіповічах больш чалавечнымі, чым, скажам, у Жлобіне, дзе Павел Мажэйка ўжо пераходжвае свой тэрмін. У яго 1 сакавіка ўзнікла права на ўмоўна-датэрміновае вызваленне, калі прайшла палова тэрміну. Па законе даецца час для падрыхтоўкі дакументаў. І максімальна Паўла яшчэ могуць трымаць да канца сакавіка.

– Вы правялі на хіміі 6 месяцаў і 4 дні. Якімі яны былі для вас?

– Яны мне не падаліся вельмі цяжкімі, хаця гэта не значыць, што яны не былі такімі на самой справе. Але я літаральна кожны дзень адчуваў магутную падтрымку і любоў, спагаду і салідарнасць з усіх канцоў свету. Пачынаючы ад таго, што ў Гродне без перапынку працаваў інтэрнэт-сайт газеты «Пагоня» і заканчваючы тым, што былы прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Гавел дасылаў словы прывітання. Прыязджалі дзесяткі людзей. У саміх Асіповічах я знайшоў тых, хто з разуменнем паставіўся да маёй сітуацыі. Таму гэтыя шэсць месяцаў прамільгнулі, як куля каля скроні.

– Якія ў вас зараз абмежаванні?

– Рашэнне асіповіцкага суда аб замене пакарання – папраўчыя працы тэрмінам на 11 месяцаў і 27 дзён з абавязковым утрыманнем з заробку 15 працэнтаў. Буду мець самыя цесныя дачыненні з міліцыянтамі. Гэта азначае, што яны маюць права ў любы момант з'явіцца на працу, каб пракантраляваць, або нават прыйсці дахаты. З нейкай перыядычнасцю я павінен буду з'яўляцца для адзначэння ў міліцыю. Потым, наколькі я зразумеў, я мушу пытацца дазволу на любыя свае выезды па тэрыторыі Беларусі. Што тычыцца замежных паездак, то гэта, як мне сказалі, выключана абсалютна. Ну і самае галоўнае – за мной, аказваецца, пасля таго, як скончацца гэтыя 11 месяцаў і 27 дзён, будзе яшчэ два гады цягнуцца шлейф судзімасці. Гэта азначае немагчымасць высоўвання мяне кандыдатам у дэпутаты, што для мяне мае прынцыповае значэнне.

– А рэдактарскую пасаду вы зможаце займаць?

– Паводле пісаных законаў – так. Адзінае, калі не памыляюся, я згубіў права на заснаванне новых сродкаў масавай інфармацыі. Але ў Беларусі з прыходам да ўлады Лукашэнкі асабліва расквітнела так званае тэлефоннае права. Я не меў абмежаванняў па прафесійнай прыкмеце і ў Асіповічах. Аднак мяне на працу ў газету «Асіповіцкі край» не ўзялі толькі па той прычыне, што патэлефанавалі і сказалі, што Маркевіча браць нельга. Што будзе на практыцы ў Гродне, пабачым з таго, як будуць дзейнічаць тыя, хто мяне апякаў апошнія два гады. Я маю на ўвазе КДБ, пракуратуру і міліцыю.

– Наколькі можна меркаваць з нашай размовы, калектыў «Пагоні» захаваўся?

– Ён існуе. Вельмі многія працуюць зараз у самых розных выданнях. Трэба карміць сем'і і нельга згубіць прафесіяналізм. Але разам з тым (мы ўжо сустракаліся вузкім колам) было прадэкларавана адно: як толькі з'явіцца варты праект (ніша «Пагоні» на беларускім інфармацыйным рынку сёння абсалютна не запоўненая, яна проста зіяе пустатою), то мы ўсе збярэмся разам на працягу аднаго тыдня.

– Яшчэ да пакарання, пасля закрыцця газеты «Пагоня», вы рабілі захады, каб зарэгістраваць новае выданне. Але вам адмаўлялі, прычым не адзін раз.

– Так. Мы зрабілі 19 спробаў зарэгістраваць новае выданне ў

Заканчэнне на стар. 6 ➲

СОЦИОЛОГИЯ

Затянувшаяся пауза

АЛЕКСЕЙ МАКОВЕЦ

В феврале 2003 года НИСЭПИ Олега Манаева провел в Беларуси экспертный опрос. 66 экспертов — полисимейкеры, ученые, бизнесмены и лидеры СМИ — рассуждали о новом президентском сроке и российско-белорусской дружбе.

Никак не удается увидеть студентам БГУ Александра Лукашенко. Напрасно вывешивало университетское начальство почти футбольный лозунг: *«Твой президент в твоем университете»*. Впустую готовились списки студентов и преподавателей, которым можно было бы задавать вопросы президенту Лукашенко.

Ну не нравится студенческая пытливость главе государства белорусского. Ведь его прежние вояжи по белорусским вузам не обходились без сакраментального вопроса о новом президентском сроке. Наверняка, посещение Белгосуниверситета тоже не обойдется без расспросов, как там насчет следующего срока. Но Александр Лукашенко тянет паузу и с визитом БГУ, и с объявлением о конституционном референдуме о продлении своих президентских полномочий.

Каков будет президентский ответ – таковыми станут и российско-белорусская дружба, и отношения с Европой. Не то чтобы позиции белорусского президента были так не надежны на родине. Просто очень уж велика роль внешнеполитической конъюнктуры.

Экспертный опрос НИСЭПИ, проведенный в феврале, проливает некоторый свет на обстоятельства затянувшейся паузы. Относительное большинство опрошенных затруднилось с анализом президентских мотивов. Хотя 30 процентов рассчитывают на референдум в 2004 году, 11 процентов считают, что судьбоносный референдум состоится уже этом году. 23 процента респондентов-оптимистов думают, что референдума не будет вообще.

Пока же президенту Лукашенко внутри страны опасаться особо некого. Пускай себе четверть государственных элитариев и три четверти негосударственных уже подыскали кандидата ему на смену.

В декабре прошлого года из всего населения только пятая часть могла бы предложить конкурента Александру Лукашенко. Поэтому опрошенные в феврале эксперты считают, что куда более опасной для белорусского лидера является внешняя реакция на его самовластные притязания в духе Ким Чен Ира, Ниязова или Хусейна.


Хотя ПА ОБСЕ назло Америке признала белорусских палатников, но при вопиющем несоблюдении правил политеса может и назад отыграть. Российское внешнеполитическое лобби Минска официального – пока защита. Но и московские товарищи уже привыкли играть, пускай по недоевропейским, а все же почти цивилизованным правилам.

Так что в готовности-неготовности России рисковать демократическим имиджем – будущее Беларуси. Беседы Александра Лукашенко и Владимира Путина с глазу на глаз определят наши внутриполитические перипетии на будущее. Встреча президентов России и Беларуси 19-20 января, по мнению подавляющего большинства экспертов, кардинально отношения между ними не изменила.

Чего и следовало ожидать. Белорусский президент обречен играть по правилам, навязанным Москвой. Импровизации, выходящие за рамки кремлевских интересов, завершаются крайне резко. Что и требовалось доказать прошлогодней газпромовской взбучкой.

России нужен не сам Лукашенко и не конкретные белорусы в Европе, а гарантии российскому капиталу и внешнеполитическим интересам Кремля. С внешней политикой проблем нет, с гарантиями капиталу вопрос решается. Пока не дано иных вариантов, и есть возможность терпеть вот такого президента Беларуси – Россия будет терпеть, выжимая из своего неудобства все возможные преимущества.

Белорусские элитарии и пролетарии, в массе не наблюдая кандидатов-конкурентов, все еще вполне уживаются с Лукашенко. Чего уж тут от Путина требовать, если белорусские эксперты, рассуждая о третьем президентском сроке, стали забывать важный исторический факт. Александр Лукашенко впервые был избран президентом не в 1996, а в 1994 году. Срок-то у него будет все-таки четвертый по демократическому счету. ■



НИСЭПИ. «Знаете того, кто мог бы успешно конкурировать с Лукашенко на президентских выборах?», %

Вариант ответа	Лидеры и эксперты (02.2003)			Население (12.2002)
	Все опрошенные	Работники госсектора	Работники негоссектора	
Да, знаю	50	25	74	18,2
Нет, не знаю	48	72	26	80,9

ДА І ПАСЬЛЯ 2 САКАВІКА

Асобны шлях у дэпутаты

АЛЕСЬ МІКАЛАЙЧАНКА, Барысаў

6 сакавіка ў памяшканьні Беларускае асацыяцыі журналістаў у Менску дэпутаты Валеры Фралоў, Уладзімер Парфяновіч і Уладзімер Навасяд далі прэсавую канфэрэнцыю перад журналістамі незалежных айчынных ды замежных СМІ. Гаворка ішла пра тыя парушэньні заканадаўства, якімі суправаджаліся нядаўнія выбары ў мясцовыя саветы.

На зьлёгку ружаватых вачох спадароў Фралова, Парфяновіча і Навасяда можна было здагадацца, што яны яшчэ не адпачылі пасьля той працы, якую добраахвотна, пачынаючы ад 2 сакавіка, узвалілі на свае шырокія дэпутацкія плечы.

Як заявілі высокія госьці БАЖ, некалькі дзён і вечароў яны спачатку назіралі за ходам галасаваньня на ўчастках Малінінскай выбарчай акругі № 9, дзе балатаваўся ў сталічны гарсавет памочнік Уладзімера Навасяда Анатоль Мельнікаў, а затым правяралі і заадно ўгаворвалі сябраў участковых камісіяў не парушаць выбарчы кодэкс. Такая размова мела падставы.

Увечары 2 сакавіка кіраўніцтва ўзгаданае камісіі ўручыла дэпутатам выніковы пратакол галасаваньня за А. Мельнікава і В. Букланава, а наступным днём – той жа самы пратакол, але ўжо зь іншымі, значна «абноўленымі» лічбамі колькасьці галасавальнікаў.

Шляхам параўнаньня абодвух дакумэнтаў і наступных няхітрых падлікаў, Валеры Фралоў, Уладзімер Навасяд ды Уладзімер Парфяновіч прыйшлі да высновы: Анатоль Мельнікаў, хаця і выйшаў наперад, аднак сябры камісыі за ноч з 2 на 3 сакавіка зьнялі зь ягонага рахунку ажно 600 галасоў выбарцаў. 50 галасоў скралі і ў другога кандыдата. Мэта маніпуляцыяў? Ды ўрэшце абвесьціць, што тут выбары не адбыліся.

Аляксандар Валчанін і Аляксей Лапіцкі распавялі пра факт адваротнага характару, калі па Жодзінскай Магістральнай акрузе № 23, дзе яны ўдвух разам з генэральным дырэктарам БелАЗу Паўлам Марыевым ішлі кандыдатамі ў Менскі абласавет, праз нізкую актыўнасьць грамадзянаў выбары не адбыліся (пра гэта ім заявіў а першай гадзіне ночы сам старшыня акрвыбаркаму Яўген Шымановіч). А вось а другой гадзіне ночы ўсім кандыдатам было паведамлена: маўляў, спачатку памылачка ў падліку патрапіла, але цяперака, дзякуй Богу, яна выпраўленая: выбары адбыліся – перамог спадароў Валчаніна і Лапіцкага герой Беларусі, знатны аўтамабілебудаўнік Павел Марыеў.

Аляксандар Валчанін з БАЖаўскае трыбуны нават зьвярнуўся да спадара Марыева. Маўляў, калі толькі ілжэпераможца ёсьць сапраўдным героем, то няхай адмовіцца ад сумнеўнага праходжаньня ў дэпутаты ды зробіць з гэтай нагоды публічную заяву.

Як паведаміў журналістам Аляксандар Валчанін, у 15-ці жодзінскіх акругах з 33-х па выбарах у гарсавет з прычыны нізкае актыўнасьці землякоў дэпутаты наагул не абраныя. Фармаваньне воргану тутэйшай прадстаўнічай улады апынулася пад пагрозай. Па ягоных словах, праз гэта «нагарэла» старшыні гарадзкой тэрытарыяльна-выбарчае камісіі (ён жа ёсьць першым намесьнікам старшыні Жодзінскага гарвыканкаму) Уладзімеру Сямашку.

Днямі кіраўнікі Менскага аблвыканкаму прымусілі спадара Сямашку напісаць заяву наконт уласнай адстаўкі зь «вертыкальнае» пасады. Камэнтуючы гэты выпадак для нашае газэты, Валеры Фралоў выказаўся ў тым сэнсе, што спадара Сямашку трэба было караць не адміністратарам з аблвыканкаму, а кіраўнікам ЦВК. І найперш за тое, што гарвыбаркам дапусьціў сур'ёзныя парушэньні выбарчага кодэксу.

Што ж тычыцца нізкай актыўнасьці выбарцаў, калі толькі яна знарок не сфальсыфікаваная, то ў гэтым віны спадара Сямашкі няма, зазначыў Валеры Фралоў. Ён паведаміў, што зараз фракцыя «Рэспубліка» падрыхтавала праект закону «Пра ўдасканаленьне выбарчай сістэмы». Калі пашанцуе, праект будзе высунуты на разгляд вясновай сэсіі, сказаў спадар Фралоў.

Можна было б яшчэ шмат распавядаць пра парушэньні выбарчага кодэксу гарвыбаркамамі ў Барысаве, Маладэчне ды іншых гарадох Меншчыны і краіны. Але рэч ня ў гэтым. А ў тым, што апазыцыя ўпершыню вось так масава, пры наяўнасьці драпежніцкай, незаконнай практыкі перасьледу «ня тых» кандыдатаў, фальсыфікацыяў вынікаў галасаваньня ды іншага махлярства высунула сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя саветы. Кепска гэта ці добра?

Адназначна адказаць на пытаньне складана. Бо, з аднаго боку, калі апазыцыя ёсьць сыстэмная, калі яна хоча зрабіць свой уплыў на ход падзеяў і ў краіне, і ў рэгіёнах, то дэмакратам трэба ісьці ў ворганы прадстаўнічае ўлады, каб накінуць аброць на прававое бязьмежжа выканаўчай «вертыкалі».

У выніку гэтых выбараў сябры БНФ, АГП, БСДП (НГ), ПКБ прайшлі ў саветы ў колькасьці аднаго адсотку ад усіх абраных дэпутатаў. Лёгка, напрыклад, стаўся дэпутатам Ждановіцкага сельсавету і адначасна дэпутатам Менскага раённага савету Юрась Зянковіч, намесьнік старшыні абласной арганізацыі БНФ. Ажно сем чалавек зь ліку сябраў узгаданых партыяў і беспартыйных дэмакратаў патрапілі ў Вілейскі раённы савет. Карацей, добра папрацавалі з наладжваньнем сыстэмы кантролю за ходам выбараў. Да ўсяго абраньнікі ў землякоў даўно маюць папулярнасьць як іх заступнікі па розных жыцьцёва важных справах перад начальствам, як выдатныя праваабаронцы.

Але зь іншага боку, мяркую, маюць рацыю і тыя дэмакратычныя палітыкі, што байкатуюць усе выбары, якія праводзяцца ў краіне пасьля разгону Вярхоўнага савету 13-га скліканьня і дзяржаўнага перавароту 1996 году.

Дэмакратычныя палітыкі-байкотчыкі маюць апаску, што цяпер часткова легітымізаваная мясцовымі выбарамі ўлады ўчыняць два сьмяротна небясьпечныя для краіны крокі – ухваляць магчымую інкарпарацыю Беларусі Расеяй і дазволяць Аляксандру Лукашэнку правесьці рэфэрэндум наконт ягонага балатаваньня ў трэці раз пад час наступных прэзыдэнцкіх выбараў. ■

ПОЛИТЭКОНОМИКА

В рассрочку на тридцать лет

НАТАША СЕРГЕЕВА

Через тридцать лет все жители Минска будут иметь 600 долларов зарплаты, 25 квадратных метров жизненного пространства на человека и ездить в скоростном трамвае, обещает главный архитектор города Александр Чадович.

Проект декрета о генеральном плане развития Минска отправился на подпись к президенту Лукашенко. А сам план был озвучен для журналистов на пресс-конференции в Мингорисполкоме главным столичным архитектором Александром Чадовичем. После подписания генерального плана его текст будет рассекречен и опубликован в виде отдельной книги.

Во время двух предыдущих попыток (в августе минувшего и январе текущего года) утверждения генплана развития столицы не смогли согласовать экономические интересы Минская область и город Минск. Среднесрочный план до 2010 года и перспективный до 2030 предусматривали передачу областных земель, а также налогов от находящихся на этой территории предприятий в городской бюджет.

3 процента пригодных для сельского хозяйства территорий, которые в числе прочих кормили овощами столицу и теперь войдут в городскую черту за счет новой кольцевой дороги, по мнению экономистов, проблем с обеспечением Минска продуктами питания не добавят. Но на этой территории находятся такие прибыльные предприятия, как торговые комплексы «Ждановичи» и «Аквабел». А налоги от них областное руководство, естественно, не захотело выпускать из своих рук.

Компромисс был найден. Пока не в пользу благосостояния менчуков. В третьем варианте декрета записано, что регистрация в качестве налогоплательщика субъектов хозяйствования, которые уже находились на этих землях до принятия генплана, при включении земель в городскую черту осуществляется областными органами. Соответственно, и налоги пойдут в областной бюджет.

Но это – только пока. Интересно, что приоритет интересов Минска все-таки есть. Это касается, например, одного из основных вопросов спора – новых земель в западной части Минска, которые могут понадобиться для развития жилых районов Красный Бор и Сухарево и для расширения здесь тепличного хозяйства агрокомбината «Ждановичи».

Для этих целей Минску будут выделены финансовые средства. Но чьи они: то ли горожан, то ли строительных компаний, то ли госбюджета? Безусловно, существует в мире тенденция роста мегаполисов, поглощающих все и вся вокруг себя. Был прецедент подобного слияния в Москве и Московской области. Но вопрос, кто будет руководить этим процессом в Минске, пока еще остается нерешенным.

Главная особенность нового генерального плана – развитие Минска преимущественно вширь. В столице будут построены три кольцевые автомобильные дороги. С учетом строящейся новой скоростной, без светофоров, дороги городская черта будет отодвинута еще на 3-5 километров.

Тогда встанет естественный вопрос об обеспечении связи между шестью периферийными районами города. А для этого необходимы новые линии метро, новые станции пересадки. Там же, где не будет метро, по Минску побежит скоростной трамвайчик.

Еще одна проблема состоит в том, что 15 процентов производственных территорий Минска размещено в центральной части города. Это в два-три раза больше, чем в других мировых столицах. Городские власти мечтают вынести за черту города завод отопительного оборудования, птицефабрику им. Крупской, завод им. Кирова, завод им. Октябрьской революции, ТЭЦ-2, мотовелозавод.

Существенным изменениям подвергнется жилищная градостроительная политика. Если сегодня новые жилые районы состоят в основном из 9-16-этажных домов, то в последующем предлагается сделать упор на 4-6-этажную жилую застройку.

Нельзя, конечно же, забывать и о пространственном комфорте человека. Малоэтажная застройка более человечна, располагает к общению, оказывает лучшее психологическое воздействие на городского жителя.

Согласно генплану, каждый столичный житель, являющийся сегодня владельцем в среднем 18,5 квадратного метра общей жилой площади, будет иметь ее на 7-10 квадратов больше, вплотную приблизившись по этому показателю к жителям соседних европейских стран.

Наконец-то решается в новом генплане и судьба «хрущевок». Их начнут реконструировать, отселяя по очереди по несколько домов во временное жилье. Внутри хрущевские квартиры сбираются полностью реконструировать, а снаружи, на шестых этажах, надстроить мансарды улучшенной планировки. Задача эта требует времени, сил и больших бюджетных денег. Сегодняшнему Минску по силам разве что эксперимент с несколькими домами по улице Орловской.

Проектом генплана предусматривается и заметный рост в высоту деловых зданий. Один из таких объектов, своего рода бизнес-сити, запланировано построить в центральной части Минска – в районе улицы Клары Цеткин. Проект будущего бизнес-центра, в состав которого включены офисы, магазины, выставочные залы, престижные отели и паркинги, представляет собой целый комплекс зданий.

По замыслу столичных планировщиков, в этой части Минска могут быть возведены в будущем не менее пяти небоскребов. Рядом планируется построить скоростную магистраль.По предварительным оценкам, проектируемая бизнес-зона может привлечь инвестиции в объеме около 2-3 миллиардов долларов. ■

ПОСТСАВЕЦКІЯ НАВІНЫ

Арменія. Паводле афіцыйных дадзеных, прэзыдэнт Арменіі Робэрт Качаран перамог у другім туры прэзыдэнцкіх выбараў. Армянскі цэнтарвыбаркам паведаміў, што за яго ў другім туры прагаласавала 67 адсоткаў выбаршчыкаў. Лідар апазыцыі Сьцяпан Дземіртчан сабраў 33 адсотка галасоў. Апазыцыя ня згодная з такімі вынікамі выбараў і адзначае шматлікія парушэньні выбарчага заканадаўства, а яе прадстаўнікі зьвярнуліся ў пракуратуру і суд з мэтаю аспрэчыць перамогу дзеючага прэзыдэнта. Згодныя з высновамі апазыцыі і міжнародныя назіральнікі з АБСЭ, якія адзначылі, што нягледзячы на дэмакратычны характар выбарчага заканадаўства, практыка яго стасаваньня не адпавядала стандартам дэмакратычных выбараў. Гэтак, адзначаўся ўціск на апазыцыю з боку ўлады, фальшаваньне бюлетэняў, няроўны доступ кандыдатаў да сродкаў масавай інфармацыі. Разам з тым, міжнародныя назіральнікі адзначылі шэраг станоўчых тэндэнцыяў: высокая актыўнасьць электарату, правядзеньне перадвыбарчых дэбатаў на тэлебачаньні ды г. д.

